# Подзвіг зямлячкі

У краязнаўчым музеі Чапялёўскай сярэдняй школы ёсць фатаграфія Лены Сцямпкоўскай. Шчыры, удумлівы позірк дзяўчыны, здаецца, спыняецца на кожным, хто сюды прыходзіць, а вусны вось-вось гатовы падарыць ласкавую ўсмешку. Такая была яна ў росквіце юных год, такой назаўсёды засталася ў памяці землякоў і ўсіх савецкіх людзей.

Пад фатаграфіяй вісіць копія Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні Лене Сцямпкоўскай пасмяротна звання Героя Савецкага Саюза.

Падоўгу ў гэтыя дні перад фатаграфіяй прастойваюць навучэнцы мясцовай і суседніх школ. Яны стараюцца назаўсёды запомніць адметныя рысы твару Лены, даведацца аб ёй як можна больш.

І вось члены музея разам са сваім кіраўніком Вячаславам Ванчукевічам накіраваліся аднойчы ў невялікую вёску на Палессі, якая называецца Мазуршчына. Сярод разгалістых хвой, на высокім узгорку, была школа, у якой вучылася Лена. Побач, праз густы лес і шырокі луг, працякае спакойная Случ. У яе цёплых і ласкавых хвалях не адзін раз побач з сяброўкамі купалася і Лена. А па вечарах яна любіла спяваць. Здавалася, лес і той пераставаў шумець, зачараваны звонкімі песнямі.

Лена спявала і марыла аб шчасці, аб далейшай вучобе, бо жыла ў той краіне, дзе чалавек можа дабіцца таго, чаго жадае.

Калі яна падрасла, бацькі пераехалі ў адзін з саўгасаў Ташкенцкай вобласці. Там Сцямпкоўская паступіла ў педагагічны інстытут і рыхтавалася стаць гісторыкам. Лена сама любіла прасторы Радзімы, яе людзей і марыла расказваць пра гэта сваім будучым вучням. І, вядома, не думала яна, не чакала, што і самой прыдзецца ўпісаць слаўную старонку мужнасці і гераізму ў гісторыю подзвігаў Вялікай Айчыннай вайны.

Вораг сабраў вялікую сілу, быў бязлітасным да савецкіх людзей, ненавідзеў усё, што было створана іхнімі рукамі. Лена слухала зводкі Інфармбюро і ведала, што ў тыя мясціны, дзе яна нарадзілася, уварваліся крывавыя фашысты. Яны спапялілі школу, у якой яна вучылася, расстрэльвалі мірных людзей, уганялі яе сяброўак на катаргу ў Германію.

## У ПАМЯЦІ НАРОДНАЙ

— Хачу на фронт! — заявіла студэнтка ў гаркоме камсамола.

— Нямецкую мову ведаеш? — запыталіся ў яе.

— Ведаю.

— Атрымлівай тады накіраванне ў школу радыстаў...

Вучыцца доўга не было калі. Вораг стаяў ля варот Волгаграда. Фашысты ірваліся да апетай у песнях ракі. Артылерыйская кананада не змаўкала ні днямі, ні начамі. У адным з батальёнаў, які стрымліваў варожыя атакі, была радыстка Лена Сцямпкоўская. Па рацыі яна трымала сувязь з палком, перадавала ў штаб каштоўныя звесткі аб ворагу.

З кожным днём фашысты ўзмацнялі атакі і агонь па застаўшыхся ў жывых байцах батальёна, спрабуючы акружыць іх і захапіць у палон. На ўліку быў кожны патрон, кожная граната. Усё бліжэй і бліжэй падыходзілі фашысты, выразна чуваць былі выкрыкі іхняга афіцэра.

Сцямпкоўская не спыняла сувязі з палком, спяшалася перадаць апошнія звесткі, а калі вораг наблізіўся, разбіла рацыю і прыцэлілася з вінтоўкі ў фашыста. Выстрал — і немец уткнуўся ў зямлю. За ім другі, трэці... Але тут патроны скончыліся, фашысты кінуліся да радысткі, заламалі рукі...

Яе дапытвалі і катавалі, катавалі і зноў ставілі адно пытанне за другім, але мужная радыстка маўчала. Тады эсэсаўскі афіцэр загадаў накрыць багаты стол, паказаў на яго Сцямпкоўскай і сказаў на сваёй мове:

— Ты будзеш есці гэтак кожны дзень, станеш цудоўна апранацца, будзеш гуляць на модных курортах. Пашкадуй сваю маладосць...

Гнеўна глянулі вочы разведчыцы проста ў твар эсэсаўца. Ён забываў, што перад ім камсамолка. Прыманкі, якія яму ўдаваліся на Захадзе, на савецкіх людзей не дзейнічалі.

Замест адказу Лена плюнула ў перакошаны ад злосці твар фашыста і крыкнула:

— За мяне адпомсцяць! Няхай жыве Радзіма!..

Было гэта 22 гады назад, у жніўні, калі Лена мела ўсяго 21 год.

За яе, як і за ўсіх, адпомсцілі. Зноў у тых мясцінах, дзе нарадзілася Лена, гудуць на палях трактары, на школьным двары чуваць звонкія галасы. А летам на беразе Случы ў лагеры кожны год адпачываюць юныя ленінцы.

Багацее калгас «Праўда». І часта мазуршчынцы ўспамінаюць сваю слаўную зямлячку, свята захоўваюць аб ёй памяць у сэрцах.

У. НОВІК.